Падтрымай "Вясну" на PATREON

Працяг ганебнай эпапеі: 6 снежня - суды над удзельнікамі мірных сходаў

дапоўнена

06.12.2019 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Суд Маскоўскага раёна Мінска

Суд Маскоўскага раёна Мінска распачынае 6 снежня серыю адміністрацыйных працэсаў над удзельнікамі перадвыбарчых пікетаў і мітынгаў, якія адбыліся ў сталіцы ў лістападзе. Дзень таму ў Цэнтральным судзе разгледжаныя 8 адміністрацыйных спраў, заведзеных на актывістаў па арт 23.34 і 17.1 КаАП. Агульная сума штрафаў склала 7 650 рублёў.

Вынікі судоў, якія адбыліся ў Мазыры і Берасці высвятляюцца.

Што вядома праваабаронцам сёння?

Максім Вінярскі, за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве складзены пратакол па частцы 3 арт. 23.34 ч.1 КаАП; Суд Маскоўскага раёна Мінска. Пачатак у 09.15. Суддзя - **Таццяна Матыль.**

Сведкі – супрацоўнікі міліцыі – **Місюля і Трышкін.**

Суддзя зачытвае пратакол, Максім Вінярскі прыняў удзел у пікетаванні, без дазволу, ля ЦВК, выкарыстоўваючы расцяжкі. Ён жа 11 лістапада у Фэйсбуку размясціў допіс аб правядзенні несанкцыянаванага мерапрыемства 15 лістапада. Правапарушэнне здзейсненае паўторна на працягу года.

Суддзя: Вінярскі неаднаразова прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці. Скрыншот - рэчавы доказ, дзе бачны Вінярскі ў складзе групы грамадзян.

Кажуць аб тым, што заяўку на перадвыбарчы пікет падавала кандыдатка Алена Талстая, але Кастрычніцкая плошча ўваходзіць у пералік забароненых для пікетавання месцаў.



Сведкі: зправа - намеснік начальніка ў Маскоўскім РАУС А. Трышкін

Сведка Андрэй Трышкін: 16 лістапада каля 18:00, калі я сумесна з Місюля нёс службу, мы былі ў цывільным адзенні. Дзяжурная частка Маскоўскага раёна патэлефанавала, сказала, што група асоб вылучылася да ЦВК. Праз 15 хвілін група асоб, каля 20 людзей была заўважаная каля гасцініцы Мінск. Была расцяжка і каля 11 сьцягоў. У цэнтры быў Вінярскі з расцяжкай і гукаўзмацняльнай калонкай ў другой руцэ. Пасля падышлі да ЦВК. Некалькі чалавек сталі прамаўляць прамовы, што не згодныя з правядзеннем выбараў, выбары несумленныя. Баста, дыктатура. Вінярскі апошні узяў мікрафон, сказаў што мы і далей будзе прыводзіць мерапрыемствы. На гэта акцыя была скончаная, а 20:00. Канчаткова сышлі ў 20:10.

Выносіцца пастанова - штраф **50 базавых велічынь**.

Наста Гусева, за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве складзены пратакол па ч.1 арт. 23.34 КаАП. Суд Маскоўскага раёна Мінска. Пачатак - 10.15; **Суддзя - Лідзія Цяліца.**

Пастанова - штраф **30 базавых велічынь**.

Арцём Чарняк, за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве складзены пратакол па ч.3 арт. 23.34 КаАП. Суд Маскоўскага раёна Мінска. Пачатак - 9.15; Суддзя - **В. Казак.**

Пастанова - штраф **50 базавых велічынь**.

Яўген Афнагель, за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве складзены пратакол па ч.3 арт. 23.34 КаАП. Суд Маскоўскага раёна Мінска. Пачатак - 9.15; Суддзя - **Юлія Варакса.**

Андрэй Шарэнда, за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве складзены пратакол па арт. 23.34 КаАП. Суд Маскоўскага раёна Мінска; Пачатак - 9-15. Суддзя - **Ю. Машкетаў.**

Андрэй на суд не з'явіўся. Суддзя Машкетаў вынес пастанову без удзелу Шарэнды аб пакаранні яго штрафам у памеры **50 базавых велічынь**.

Зміцер Казлоў, за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве складзены пратакол па частцы 1 арт. 23.34 ч.1 КаАП; Суд Маскоўскага раёна Мінска; Пачатак - 10.15; **Суддзя Ю. Машкетаў.**

Казлоў на судзе не з'явіўся. Суддзя зачытаў пратакол і рапарт. З 19:50 да 20:00 15 лістапада перад будынкам Цэнтрвыбаркама Казлоў занаходзіўся у складзе группы грамадзян, разам з Нікалайчык і Чарняком трымалі расцяжку.

Вынік - **25 базавых велічынь (637,5 рублёў)**.

Алесь Круткін, за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве складзены пратакол па частцы 1 арт. 23.34 КаАП; Суд Маскоўскага раёна Мінска; Пачатак - 10.15; Суддзя - **В. Казак.**

29 лістапада Суд Полацкага раёну і г. Полацка вынес рашэнне аб арышце на 15 сутак грамадскага актывіста **Алеся Круткіна**. Прычына – рэпост у Facebook. Суддзя Віктар Балыка палічыў такі рэпост заклікам да масавага мерапрыемства і прыцягнуў Круткіна да адказнасці па частцы 3 артыкула 23.34 КаАП (Парушэнне парадку правядзення масавага мерапрыемства).

Суд перанеслі на 10 снежня, бо Круткін на сутках.

Андрэй Войніч, складзены пратакол па арт. 23.34 ч.1 КаАП. Суд Маскоўскага раёна Мінска. Пачатак - 14.15. Суддзя - **Таццяна Матыль.** Вынік - **30 базавых велічынь.**

Наталля Саматыя, за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве складзены пратакол па частцы 1 арт. 23.34 ч.1 КаАП; Суд Маскоўскага раёна Мінска. Пачатак у 14.15. Суддзя - **Юлія Варакса.**

Сведкі **Місюля і Трышкін** не з'явіліся. Суддзя зачытала рапарт Трышкіна, пратаколы іх апытання наконт акцыі 16 лістапада. Вынік - **25 базавых велічынь (637,5 рублёў).**

Дзяніс Урбановіч, за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве складзены пратакол па ч.3 арт. 23.34 КаАП. Суд Маскоўскага раёна Мінска. Пачатак - 9.15; Суддзя - **Л. Цяліца.**

Пастанова - штаф у памеры **50 базавых велічынь**.



Судны чацвер: разгляд спраў удзельнікаў мітынгаў і шэсцяў падчас выбарчай кампаніі

5 лістапада ў Цэнтральным судзе Мінска разгледжаныя 8 адміністрацыйных спраў, заведзеных на актывістаў па арт 23.34 і 17.1 КаАП. Агульная сума штрафаў склала 7 650 рублёў. Вынікі судоў, якія адбыліся ў Мазыры і Берасці пакуль невядомыя.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык

"У мяне ў першы ж дзень на ЦІПе здарыўся прыступ асфіксіі", — былая арыштантка Акрэсціна

"Мы прыдумлялі розныя махінацыі, каб папросту выжыць", — экс-зняволены пра жыццё і працу ў шклоўскай калоніі

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Дзень палітвязняў Беларусі. Да якіх мерапрыемстваў можна далучыцца?



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Патрабуем правясці расследаванне па факце смерці Мікалая Клімовіча і адсутнасці належнай медычнай дапамогі ў калоніях

Бацьку і дачку пакаралі "хатняй хіміяй" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Палітзняволенаму Яну Папковічу прысудзілі 4 гады калоніі

Сяржук Сыс – Валянціну Стэфановічу: "Ганаруся табой, тваёй воляй і характарам"

Праваабаронца і валанцёрка "Вясны" Марыя Тарасенка: "Я маю ўнікальную магчымасць падтрымліваць людзей"

"Яго місія ў большым. Яго мэта — нешта дасягнуць і даказаць": вязні шклоўскай калоніі пра Вітольда Ашурка

Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

Радыё Свабода

Камунікат
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

Вытокі

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

СЯБРОЎСТВА

ENEMO
European Network of Election Monitoring Organizations

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY